*І. А. Малахава, кандыдат*
*педагагічных навук, дацэнт,*
*І. М. Цэван, аспірант*
*БДУ культуры і мастацтваў*

# ДА ПРАБЛЕМЫ ПАДРЫХТОЎКІ РЭПЕРТУАРУ СУЧАСНЫХ ДЗІЦЯЧЫХ МУЗЫЧНЫХ КАЛЕКТЫВАЎ

Дзіцячая музычная творчасць, як важная частка мастацкай творчасці кожнага народа, сёння і на працягу многіх папярэдніх стагоддзяў была адной з распаўсюджаных і сацыяльна значных формаў правядзення дзіцячага вольнага часу.

Несумненнай каштоўнасцю арганізаванай аматарскай мастацкай (музычнай) дзейнасці з'яўляецца магчымасць задавальняць мастацкія інтарэсы і патрэбнасці яе ўдзельнікаў, мець зносіны з іншымі людзьмі – аднагодкамі, кіраўнікамі калектываў, музыкантамі; яна з'яўляецца прасторай рэалізацыі сацыякультурнай практыкі чалавека, месцам даступнага адпачынку, сродкам выхавання і мастацка-творчага развіцця асобы.

Дзейнасць музычных калектываў мае сваю спецыфіку, яна прадстаўлена пераважна выканальніцкімі калектывамі, дзе яскрава прагледжваецца арыентацыя на падрыхтоўку дзяцей да сцэнічных выступленняў. Выканальніцкія віды аматарскай мастацкай дзейнасці звычайна пераважаюць над іншымі, такімі, як слуханне і сачыненне музыкі.

Музычныя заняткі ў сучасных дзіцячых творчых калектывах краіны адбываюцца ва ўмовах сацыяльна-кантралюемай і кіруемай педагагічнай прасторы ўстаноў культуры і дадатковай адукацыі і праходзяць на базе клубаў, дамоў культуры і народнай творчасці, канцэртных устаноў, цэнтраў, палацаў, дзіцячых школ мастацтваў. Яны з'яўляюцца месцам для рэалізацыі патрэбнасцей падрастаючага пакалення ў розных відах мастацкай дзейнасці, сродкам развіцця мастацкіх здольнасцей, сродкам рацыянальнага, карыснага адпачынку.

Вакальныя і інструментальныя ансамблі, хоры, аркестры народных інструментаў, а таксама фальклорныя калектывы краіны ўяўляюць сабой праяву і адначасова працяг песеннай і інструментальнай творчасці народа на аснове выпрацаваных стагоддзямі мастацкіх традыцый.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

Аснову вакальна-харавой творчасці беларускага народа складаюць народныя песні, якія ахопліваюць некалькі вялікіх гістарычных пластоў.

Песні каляндарна-земляробчага цыклу прадстаўлены кАляднымі, шчадроўскімі, масленічнымі, веснавымі, валачобнымі, юраўскімі, купальскімі, пятроўскімі, жніўнымі, яравымі, ільнянымі, восеньскімі песнямі, да якіх прымыкаюць зімовыя, веснавыя і летнія карагоды і гульнявыя песні. Песні сямейна-абрадавага цыклу прадстаўлены радзіннымі, вясельнымі, галашэннямі, калыханкамі. Мужчынскія бурлацкія, чумацкія, казацкія, рэкруцкія, салдацкія, а таксама бытавыя, жартоўныя, любоўна-лірычныя песні ўзніклі ў перыяд фарміравання беларускай народнасці (XIV–XVI стст.) і ў часы сялянскіх паўстанняў (XVI–XVIII стст.) – яны складаюць асобны культурна-гістарычны пласт. Песні XIX ст. – батрацкія, адыходніцкія, рабочыя і рэвалюцыйныя, а таксама "літаратурныя" песні на словы прафесійных паэтаў і прыпеўкі-частушкі. Песні савецкага перыяду складаюць рэвалюцыйныя, чырвонаармейскія, калгасныя, палітычныя, песні пра канстытуцыю, пра новую долю жанчын. Песні Айчыннай вайны – гэта партызанскія, патрыятычныя і іншыя. Абазначаныя песенныя ўзоры народнай творчасці складаюць падмурак выканальніцкай дзейнасці сучасных мастацкіх дзіцячых (і дарослых) калектываў у рэспубліцы.

Таксама вялікае месца ў сучаснай беларускай культуры займае інструментальная музыка. Невычэрпнай крыніцай для музычнай творчасці сучасных дзіцячых інструментальных калектываў народнага кірунку з'яўляюцца інструментальныя традыцыі беларускага народа.

Традыцыйны інструментальны рэпертуар уключаў сігнальную музыку (звязаную з магічнымі абрадамі, пастухоўскімі, паляўнічымі і ваеннымі дзеяннямі), песенныя і танцавальныя найгрышы, вясельныя маршы, імправізацыі, гукаперaймальныя, ілюстрацыйныя п'есы. Яны і сёння складаюць аснову рэпертуару дзіцячых ансамбляў і аркестраў народных інструментаў.

Музычныя калектывы, якія працуюць з апорай на народныя традыцыі, адной з праблем маюць праблему падрыхтоўкі рэпертуару. Справа ў тым, што недастатковая колькасць спецыяльных рэпертуарных зборнікаў для дзяцей малодшага і падлеткавага ўзросту, а таксама неабходнасць прыстасавання



РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

традыцыйных твораў да ўзросту ўдзельнікаў калектыву, выканальніцкага ўзроўню, складу вымушае кіраўнікоў дзіцячых калектываў займацца аранжыроўкай і апрацоўкай твораў.

У даведачнай літаратуры [1, с. 83] мы сустракаем наступнае вызначэнне аранжыроўкі.

Аранжыроўка (ад франц. arranger, літаральна прыводзіць у парадак, уладкоўваць) – прыстасаванне пэўнага музычнага (аўтарскага ці народнага) твора да магчымасцей і асаблівасцей канкрэтнага выканаўчага калектыву ці саліста; асобны від творчай дзейнасці (часцей кіраўніка выканаўчага калектыву); адна з форм засваення народных песенных і інструментальных традыцый.

Асноўнай спецыфікай аранжыроўкі з'яўляецца тое, што яна накіравана на прыстасаванне пэўнага музычнага твора да магчымасцей і асаблівасцей выканальніцкага калектыву і раскрыццё заключанага ў гэтым творы мастацкага вобраза. Такім чынам, увага аддаецца дасягненню даступнасці выканання канкрэтным складам удзельнікаў, песня прыстасоўваецца да галасоў, або інструментальны твор да выканальніцкага ўзроўню дзяцей.

Вылучаюць 4 асноўныя віды аранжыроўкі:

Распеў "на галасы" – у жывой выканальніцкай практыцы стварэнне падгалоскаў да асноўнага напеву, сучасная практыка дзейнасці дзіцячых і маладзёжных аматарскіх фальклорных калектываў, якія пераймаюць народныя спеўныя традыцыі вусным шляхам.

Музычна-тэкставае рэдагаванне – упарадкаванне голасавядзення ў партытуры (пры наяўнасці ў фальклорным творы складанага вар'іравання) з мэтай захавання і адлюстравання ў 2–3 строфах меладычных і ладагарманічных варыянтаў твора ў цэлым.

Аблегчанае выкладанне – для дасягнення даступнасці пэўнага ўзору для выканаўцаў, тэхнічныя і мастацкія магчымасці якіх абмежаваны (дзіцячыя калектывы, аматарскія і вучэбныя хоры і ансамблі розных складаў). Увага да стылёвай і выканальніцкай спецыфікі фальклорнага арыгінала патрабуе захавання яго асновы (напеву ці найгрыша, ладагарманічных асаблівасцей, тыпу шматгалосся) і дапускае частковае змяненне структуры (транспанаванне ў зручную танальнасць, аб'яднанне аднафункцыянальных галасоў, замена гарманічных інтэрвалаў на меладычныя і іншае).



РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

Пералажэнне для іншага, у параўнанні з арыгіналам, складу інструментаў ці галасоў. Такая аранжыроўка ствараецца з улікам стылёвых канстант узораў розных жанраў і гістарычных пластоў (напрыклад, прынцыповае аднагалоссе твораў раннетрадыцыйных – абрадавых, калыханак, галашэнняў, лірычных; у позднетрадыцыйных – розныя формы шматгалосся).

У адрозненне ад аранжыроўкі, апрацоўка ставіць сваёй мэтай развіццё мастацкага вобраза першакрыніцы пры дапамозе шырокага выкарыстання музычна-выразных сродкаў, ўласна тэрмін традыцыйна вызначаецца як змяненне арыгінальнага музычнага твора шляхам аранжыроўкі, арганізацыі або транскрыпцыі.

Плённая работа кіраўніка калектыву па стварэнні аранжыровак і апрацовак музычных твораў з улікам ўзросту ўдзельнікаў калектыву, выканальніцкага ўзроўню і канкрэтнага складу можа вырашыць некаторыя праблемы падрыхтоўкі рэпертуару ў сучасных дзіцячых музычных калектывах.

*Беларускі* фальклор: энцыкл.: у 2 т. Т. 1: А капэла – Куцця / рэдкал.: Г. П. Пашкоў [і інш.]. – Мінск: БелЭн, 2005. – 768 с.: іл.

*Мэн Хао, аспирант*
*БГУ культуры и искусств.*
*Научный руководитель – О. В. Мазаник,*
*кандидат искусствоведения, доцент*

## ЖАНР КОНЦЕРТА В ТВОРЧЕСТВЕ КИТАЙСКИХ КОМПОЗИТОРОВ (НА ПРИМЕРЕ КОНЦЕРТА ДЛЯ СКРИПКИ С ОРКЕСТРОМ ЧЕН ГАНА И ХЭ ЧЖАНХАО «ВЛЮБЛЕННЫЕ БАБОЧКИ»)

Концерт для скрипки с оркестром «Влюбленные бабочки» (кит. «梁山伯与祝英台») – одно из самых известных китайских музыкальных сочинений и, бесспорно, одно из самых известных за пределами Китая. Это произведение создано по древней легенде, которая имеет название «Влюбленные бабочки» [1]. Концерт написан для академического состава западноевропейского типа. Однако в сольной партии используются отдельные приемы звукоизвлечения, характерные для китайских народных струнно-смычковых инструментов. Кроме того, традиционно китайские композиторы писали музыку



РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ